# Ігар Марзалюк: Адукацыйныя рэформы патрабуюць сістэмнасці

**Прызнаюся шчыра, калі атрымаў рэдакцыйнае заданне знайсці кампетэнтнага суразмоўцу для інтэрв'ю па праблемах рэфармавання адукацыйнай сферы, лепшай кандыдатуры, чым вядомы беларускі гісторык і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар Марзалюк, і не думаў шукаць. Зразумела чаму. Ён, выхадзец з настаўніцкай сям'і, доктар гістарычных навук, прафесар, бацька школьніка і старшыня парламенцкай Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы, напэўна, як ніхто іншы ў курсе ўсіх адукацыйных спраў...**



Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы, доктар гістарычных навук, прафесар

**– Ігар Аляксандравіч, мяркуючы па назве Пастаяннай камісіі, якую Вы ўзначальваеце, яе паўнамоцтвы распаўсюджваюцца адразу на некалькі сацыяльна важных сфер. Адна з іх – адукацыя, якая апошнім часам, дзякуючы абмеркаванню паправак, скажам так, профільнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, прыцягнула да сябе пільную ўвагу як спецыялістаў, так і звычайных грамадзян. Як ваша камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адукацыйнай сферы?**

– Да многіх заканадаўчых дакументаў я меў дачыненне, яшчэ калі быў членам Савета Рэспублікі пятага склікання. Папярэдняя камісія Палаты прадстаўнікоў працавала вельмі добра і эфектыўна, што пацвярджае прыняцце асноватворных заканадаўчых актаў, у тым ліку і Кодэкса аб культуры. Склад цяперашняй камісіі працуе над другой рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі. І для дэпутатаў справа гонару зрабіць яго высакаякасным, каб кожная норма гэтага дакумента адпавядала інтарэсам усёй педагагічнай супольнасці, кожнага настаўніка, навучэнца і яго бацькоў. Ставіцца задача зрабіць усё магчымае для таго, каб дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў сферы адукацыі і навукі было рэальнасцю. Неабходна зрабіць гэтыя працэсы празрыстымі, даступнымі. Мы будзем імкнуцца да таго, каб стварыць яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця адукацыі, бо без гэтага немагчыма ажыццявіць тэхналагічныя прарывы, якія вывелі б нашу краіну на перадавы ўзровень. Перад намі стаіць задача зрабіць адукацыйную сферу прыярытэтнай, таму што яна з'яўляецца падмуркам паспяховага развіцця нашай краіны і стварэння яе станоўчага іміджу.

**– Тады давайце пагаворым пра дапаўненні і змяненні, якія прапануецца ўнесці ў абноўлены Кодэкс аб адукацыі. Як Вам, напрыклад, тэзіс пра шосты школьны дзень?**

**НАША ДАСЬЕ**

МАРЗАЛЮК Ігар Аляксандравіч.

Нарадзіўся ў 1968 годзе ў г.п. Краснаполле Магілёўскай вобласці.

У 1992 годзе скончыў Магілёўскі педагагічны ўніверсітэт (з 1997 года – Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова), дзе выкладаў у 1996–2016 гадах.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 5-га склікання (2013–2016).

3 верасня 2016 года – дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 6-га склікання, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Доктар гістарычных навук (2003), прафесар (2011).

Аўтар шматлікіх навуковых манаграфій і артыкулаў.

Сфера навуковых інтарэсаў: матэрыяльная і духоўная культура Магілёва і іншых гарадоў Беларусі эпохі феадалізму, аналіз этнаканфесіянальных і сацыякультурных стэрэатыпаў жыхароў сярэдневяковай Беларусі.

– На маю думку, гэта праблема штучна раздуваецца некаторымі сродкамі масавай інфармацыі. Размова ж зусім не пра тое, што субота стане паўнавартасным вучэбным днём для школьнікаў. Не разумею, з-за чаго ў бацькоў такі перапалох. Шосты школьны дзень існуе і цяпер. Па суботах дзецям даецца магчымасць займацца тым, што ім блізкае, да чаго яны праяўляюць найбольшую цікавасць – гурткі, факультатывы па інтарэсах і г.д. Менавіта па гэтых днях класныя кіраўнікі праводзяць з імі экскурсіі, арганізоўваюцца канцэрты… Што дрэннага, калі, як прапануе Мінадукацыі, па суботах у школах будуць праводзіцца яшчэ і фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы, спаборніцтвы, заняткі аб'яднанняў спартыўнай накіраванасці, гурткоў? А пільная ўвага, якая «будзе ўдзелена арганізацыі і правядзенню прафарыентацыйных мерапрыемстваў, дапрафесійнай падрыхтоўцы і прафесійнаму навучанню школьнікаў на базе прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў», дапаможа нашым дзецям спасцігнуць навыкі розных прафесій…

Як бацька школьніка, я разумею трывогу некаторых наконт таго, што шосты школьны дзень можа стаць абавязковым для наведвання. Маўляў, бацькі, пяць дзён на тыдні з ранку да вечара занятыя на працы, і так мала бываюць са сваімі дзецьмі, а выхадныя для іх – шанц пабыць разам, але адзін дзень у іх забіраюць… І вось тут, я лічу, ніякага прымусу не павінна быць. Бацькі маюць права размяркоўваць суботні дзень так, як патрэбна ім і іх дзецям – неабходна ехаць да бабулі ў вёску, значыць, сабраліся і паехалі. Па суботах ваш сын ці дачка наведвае рэпетытара ці ходзіць у гурток мастацкай самадзейнасці – калі ласка: ніхто не мае права абмяжоўваць такія дзеянні і насільна прымушаць наведваць школу ў шосты дзень тыдня.

Лічу правільным, што ў суботу вырашана больш увагі ўдзяляць і ўзаемадзеянню школы з сям'ёй – бацькам прадастаўлена гарантаванае права, пры неабходнасці, сустрэцца з педагогамі-прадметнікамі, каб абмеркаваць з імі якраз тыя пытанні, якія яны з-за сваёй занятасці не могуць вырашыць у будныя дні. А хіба блага тое, што дзеці з нядобранадзейных сямей па суботах не будуць самі па сабе, а прымуць удзел у школьных мерапрыемствах?



▲ Факультатыўныя заняткі ў шосты школьны дзень праводзіць бібліятэкар гімназіі № 5 г. Мінска Надзея Пудышава

Калі трывожны пасыл у СМІ наконт шостага школьнага дня ідзе ад настаўнікаў, якія турбуюцца, што па суботах ім давядзецца працаваць ледзьве не бясплатна, то для гэтага няма ніякіх падстаў – аплата іх працы ў гэты дзень дакладна прапісана. Акрамя таго, кіраўнікам навучальных устаноў дадзена права ўстанаўліваць стымулюючыя выплаты за правядзенне мерапрыемстваў у суботні дзень.

**– Ігар Аляксандравіч, ці праўда, што ў нас цяпер пачнуць прымаць дзяцей у першы клас з пяці гадоў?**

– Тое, што ўсіх дзяцей будуць адпраўляць у 5-гадовым узросце ў школу, – абсалютна фэйкавая інфармацыя. Справа ў тым, што ў нас бацькі дзеляцца на дзве катэгорыі: тыя, якія імкнуцца як мага пазней аддаць сваіх дзяцей у школу, прыкладна ў сем гадоў – і я іх думку падзяляю, і тыя, якія лічаць, што іх 5-гадовае дзіця – геній і вундэркінд і яму неадкладна трэба за парту, бо ўжо ўмее чытаць і пісаць. Як тут быць, у кожнай сям'і вырашаюць самастойна. Мой сын, напрыклад, пайшоў у школу амаль у сем гадоў: я скарыстаўся той акалічнасцю, што ён

«кастрычніцкі», па стану на 1 верасня яму не было яшчэ поўных шасці гадоў і ён у прынцыпе не мог стаць школьнікам. Гэта пайшло сыну толькі на карысць – за год хлопчык падужэў фізічна, стаў больш уважлівым, змог адказна ставіцца да вучобы і г.д.

У Кодэксе аб адукацыі і ў далейшым прадугледжваецца прыём у першы клас з шасці гадоў, а пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў дзіця можа пайсці ў школу і ў больш познім узросце. Новае ж тут у тым, што, калі ў бацькоў ёсць жаданне аддаць дзіця ў школу да дасягнення шасці гадоў, такая магчымасць ім прадастаўляецца толькі з дазволу заснавальніка ўстановы адукацыі на месцы. Ведаеце, Міністэрства адукацыі было завалена заявамі няўрымслівых бацькоў, жадаючых аддаць у школу сваіх дзяцей, якім не хапала да шасці гадоў некалькіх месяцаў. Вырашыць гэтае пытанне раней можна было толькі на ўзроўні міністра. Таму ў Кодэксе аб адукацыі і замацоўваецца права кіраўніка навучальнай установы на падставе заявы, падкрэсліваю, асабістай заявы бацькоў, вызначаць стан фізіялагічнай і інтэлектуальнай падрыхтаванасці дзяцей у няпоўных шэсць гадоў сесці за школьную парту. Па вялікім рахунку, тут нічога не змяняецца. Наадварот, спрашчаецца, так бы мовіць, магчымасць трапіць у школу дзецям, якія падрыхтаваны ўжо да вучобы, але яшчэ не дасягнулі заканадаўча замацаванага для гэтага ўзросту.

Праўда, пры гэтым узнікае акалічнасць, калі першы клас для такіх дзяцей – проста расслабленне. Для іх на ўроках вядзецца паўтор таго, што яны ўжо ведаюць, чаму іх навучылі. Не ведаю, наколькі гэта мэтазгодна. Асабіста я за вяртанне прыёму ў першы клас з сямі гадоў і за навучанне на працягу 10 класаў. У Кодэксе ж аб адукацыі заканадаўча замацаваны 6-гадовы ўзрост першакласнікаў і 11-класнае навучанне: мяняць гэтыя каноны пакуль ніхто не збіраецца. Так што ўсе хваляванні бацькоў на гэты конт беспадстаўныя.

**– Некаторыя бацькі катэгарычна супраць таго, што ў новай рэдакцыі з Кодэкса аб адукацыі знікла палажэнне аб магчымасці ажыццяўлення кантролю за працэсам навучання…**

– Лічу, што распрацоўшчыкі новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі правільна зрабілі, прыбраўшы гэтае палажэнне. Скажу, магчыма, не вельмі камплiментарную для бацькоў рэч – я сам бацька і не ўяўляю, як можна пракантраляваць працэс навучання. Прыходзіць на ўрок і слухаць, як адказваюць вучні, што ім гаворыць настаўнік? Гэта – глупства. Для вырашэння спрэчных пытанняў ёсць адміністрацыя школы. Калі я лічу, што майму генію заніжаюць адзнакі, то трэба гэтую праблему вырашаць у рабочым парадку з прыцягненнем адміністрацыі і педагога, які, як здаецца, нешта робіць не тое: прыдзіраецца, заніжае адзнакі і г.д.

Браць пад бацькоўскі ці грамадскі кантроль працэс навучання, яшчэ раз паўтару, абсурдна. Як можна нешта кантраляваць, калі ты не маеш адмысловай спецыяльнай падрыхтоўкі для гэтага? А раптам нехта захоча кантраляваць дзеянні хірурга ў час аперацыі?..

**– Што Вы думаеце наконт безнаяўнай спонсарскай дапамогі навучальным установам?**

– Нарэшце Міністэрства адукацыі прыняло абсалютна правільнае рашэнне. З такой з'явай, як збор з бацькоў наяўных грошай, трэба было заканчваць даўным-даўно. Нагадаю, што, згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, у нас бясплатная пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тым не менш пад маркай рамонту, набыцця мыйных сродкаў, інвентару ці яшчэ чаго-небудзь у навучальных установах просяць бацькоў здаць канкрэтную суму грошай. І, няма чаго ўтойваць, іншым разам гэты працэс адбываецца, як кажуць, у добраахвотна-прымусовым парадку. Вядомы, на жаль, і прыкрыя факты, калі сабраныя такім чынам грошы не апрыходаваліся і зніклі ў невядомым кірунку. Таму схема, прапанаваная міністэрствам, слушная і правільная: толькі спонсарская дапамога школе, і пералічэнне грошай толькі па безнаяўным разліку ці праз банкаўскія

ўстановы ў фонд папячыцельскага савета. Тады і размеркаванне сродкаў будзе празрыстым: кантралюючыя органы будуць ведаць, на што зрасходавана тая ці іншая сабраная сума, і бацькі, калі захочуць, змогуць у гэтым упэўніцца.

І яшчэ падкрэслю, што тэрмін «безнаяўная спонсарская дапамога» не павінен замяніць практыку добраахвотна-прымусовага збору наяўных грошай. Ніякай абавязалаўкі ў гэтай справе быць не можа, бо сацыяльны ўзровень у бацькоў вельмі розны: для адных 10–20 рублёў – нязначныя грошы, а для іншых – істотная сума. У школе таксама не маюць права патрабаваць ад бацькоў падаваць фінансавы дакумент аб пералічэнні грошай у фонд папячыцельскага савета.

**– Ігар Аляксандравіч, як Вы лічыце, цэнтралізаванае тэсціраванне – гэта плюс ці мінус адукацыйнай сістэмы?**

– Буду шчыры: калі ўвялі цэнтралізаванае тэсціраванне, я быў ад яго не ў захапленні. Сёння ў мяне крыху іншы погляд. Лічу, што трэба захаваць ЦТ па фізіцы, матэматыцы, хіміі. Але ёсць дысцыпліны, дзе такі экзаменацыйны іспыт не можа вызначаць узровень ведаў. Больш таго: калі мы хочам мець пісьменнае пакаленне, то павінны сачыненне альбо пераказ у абавязковым парадку вярнуць у школьны вучэбны працэс. Прычым для ўсіх, незалежна ад таго, збіраешся ты стаць хімікам, фізікам або гісторыкам ці філолагам. Пасля таго як вучні перасталі пісаць сачыненні, узровень агульнай пісьменнасці абітурыентаў, мякка кажучы, не вытрымлівае крытыкі. Грэбаванне літаратурай, мовай, іншымі дысцыплінамі гуманітарнага блоку прывяло да таго, што студэнт не можа нармальна напісаць заяву, у двух-трох сказах робіць да пяці-сямі памылак. Пры паступленні на асобныя спецыяльнасці ўжо існуе сумоўе. Гэта дае магчымасць неяк скаардынаваць абітурыенцкі кантынгент, адсеяць выпадковых і слаба падрыхтаваных. Хацелася б, каб такая практыка распаўсюджвалася на як мага большы пералік спецыяльнасцей, бо за сертыфікатам ЦТ не бачна асобы абітурыента, яго інтэлектуальнага ўзроўню.



▲ Цэнтралізаванае тэсціраванне ў аўдыторыі БДУ

А пакуль, на жаль, даводзіцца канстатаваць, што старшакласнікі сёння ў нас вучацца не для далейшага жыцця, а для ЦТ. На паспяховую здачу тэстаў у многім скіраваны і вучэбны працэс у 10–11-х класах. І яшчэ нюанс: пытанні для цэнтралізаванага тэсціравання не павінны выходзіць за межы школьных падручнікаў, яны мусяць быць у рамках вучэбнай праграмы. Часам жа правільны адказ на іх не заўсёды могуць даць студэнты-першакурснікі і нават другакурснікі. Я не кажу, што такія пытанні дрэнныя, я за тое, каб яны былі пад сілу ўчарашнім школьнікам.

**– А якая, на Ваш погляд, сістэма школьнай адукацыі найбольш прымальная? У каго нам трэба вучыцца?**

– Вось-вось, нам патрэбна менавіта вучыцца, а не ўсляпую пераймаць чужыя напрацоўкі. Так, напрыклад, у свой час зрабілі ў Фінляндыі. Яны скарысталі савецкі досвед адукацыі, узяўшы з яго лепшае – школу жыцця, індывідуальны падыход да дзіцяці, профільнае навучанне і інш., адаптавалі, зразумела, уклалі ў гэтую справу грошы, і ў выніку фінская школа стала лепшай у свеце. На фінаў паглядзеў Сінгапур, унёс свае карэктывы і зрабіў яшчэ лепшую адукацыйную мадэль. Па іх шляху, дарэчы, пайшла і Эстонія, дзе сістэма адукацыі фінансуецца прыкладна ў такім жа аб'ёме, як і ў Беларусі. І эстонцам выніку

чакаць доўга не давялося: у 2015 годзе па ўзроўні адукацыі школьнікаў іх краіна была першай у Еўропе і трэцяй у свеце. Апошні факт вельмі яскрава гаворыць сам за сябе. Ці не праўда?..

**– Сапраўды, гэта ўражвае. Але з чаго патрэбна пачынаць нам, каб наблізіцца да дасягненняў эстонцаў?**

– Спачатку трэба зразумець, на якім свеце знаходзіцца наша школьная адукацыйная сістэма. Існуе міжнародная праграма па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў (Programme for International Student Assessment – PISA). Гэта – своеасаблівы тэст на пісьменнасць школьнікаў і іх уменне выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы. А яшчэ параўнальныя вынікі такіх даследаванняў у розных краінах – аснова для ўдасканалення навучальнага працэсу і ў цэлым канкрэтнай нацыянальнай адукацыйнай сістэмы. Праводзіцца такі маніторынг раз у тры гады, а ўдзельнічаюць у ім 15-гадовыя падлеткі.

Сёння з дапамогай гэтай праграмы ацэньваюцца веды школьнікаў больш як у 60 краінах, якія далучыліся да гэтага працэсу. Сярод іх і многія постсавецкія дзяржавы, у тым ліку Азербайджан, Казахстан, Латвія, Літва, Расія, Эстонія. На вялікі жаль, у гэтым спісе пакуль няма Беларусі: наша краіна, магчыма, далучыцца да праграмы толькі ў 2018 годзе, хоць быў намер зрабіць гэта яшчэ ў 2010-м. Выходзіць, мы страцілі як мінімум 8 гадоў, за якія на падставе вынікаў аўтарытэтнага маніторынгу маглі б мэтанакіравана, без паспешлівых рэформ, несістэмных шарахання ў працаваць над удасканаленнем сваёй нацыянальнай адукацыйнай сістэмы.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што праграма PISA – не панацэя, хоць і мае пад сабой моцную фундаментальную аснову. Нам неабходна вяртацца да нармальных падручнікаў і праграм, трэба звяртацца да сённяшніх рэалій і памятаць, што свет мяняецца. Школа, адукацыя і навука, перафразуючы выказванне славутага канадскага хакеіста беларускага паходжання Уэйна Грэцкі, павінны бегчы не на шайбу, а туды, у тое месца, куды гэтая шайба мусіць прыляцець. Без стратэгічнага прагназавання, без разумення, куды і якія намаганні будзем укладваць, далёка не зойдзем. Як не ўбачым і канкрэтных зменаў, пакуль маніторынгам ведаў у нашай адукацыйнай сістэме будзе займацца Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, падпарадкаваны Міністэрству адукацыі.

Зноў-такі, каб павышалася якасць адукацыі, трэба павышаць і заробкі, і прэстыж настаўніка. У Фінляндыі 10 % лепшых выпускнікоў ідуць у педагогі. Чаму? Таму што там высокія зарплаты. Заўважана заканамернасць: самая якасная адукацыя там, дзе ў настаўнікаў добрыя заробкі, а дзе добра плацяць настаўнікам, там прарывы ў эканоміцы. І з дакладнасцю наадварот…

Трэба змяніць і некаторыя крытэрыі ацэнкі выніковасці працы настаўніка. Напрыклад, сёння адным з іх з'яўляецца не якасць выкладання прадмета, а колькасць узнагарод, атрыманых вучнямі ў тым ліку за навукова-даследчую работу. Безумоўна, гэта ўхвальны кірунак, але яго не трэба ставіць у прыярытэтныя. Нельга арыентавацца толькі на выдатніка, варта даваць кожнаму вучню магчымасць вызначыць менавіта свой напрамак у жыцці, рэалізаваць свае здольнасці.

**– А як Вы ставіцеся да сярэдняй спецыяльнай адукацыі?**

– Выключна станоўча. Больш таго, я ў захапленні ад карпаратыўнасці кіраўнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія, нягледзячы на спробы рэфармаваць і іх сістэму, здолелі адстаяць свае прыярытэты. І, як вынік, у Беларусі даволі неблагая сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

А вось з вышэйшай адукацыяй ёсць праблемы. Яна ў нашай краіне звышдаступная, з-за чаго мы страчваем яе якасць. На мой погляд, да атрымання далейшай пасля школы адукацыі нам трэба падыходзіць з пункту гледжання інтэлектуальнай падрыхтаванасці выпускнікоў. Ёсць розны іх узровень: адны, умоўна кажучы, захапляюцца





◀▲У час правядзення II Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus – 2016

вершамі, другія – формуламі, а трэцім наогул начхаць на ўсё. Таму для ўсіх павінны быць абавязковымі толькі пачатковая і базавая школы. Калі пасля 9 класаў у цябе, скажам, сярэдні бал 6 і ніжэй, то ты маеш права на атрыманне толькі спецыяльнай сярэдняй адукацыі, ці інакш – рабочай спецыяльнасці ў навучальнай установе, якая адпавядае тваім схільнасцям. Так, напрыклад, у Германіі амаль 70 % выпускнікоў школ праходзяць праз гімназіі, дзе набываюць рабочыя прафесіі, а ў ВНУ адразу пасля школы паступаюць толькі самыя падрыхтаваныя. Так і ў нас у 10–11-я класы на профільнае навучанне павінны ісці лепшыя. І нічые тут правы, у тым ліку і канстытуцыйныя, як камусьці можа падацца, не абмяжоўваюцца. У гэтай справе павінна быць сістэмнасць. А каб убачыць, як гэтая сістэма функцыянуе, не трэба ехаць у далёкія краіны – варта зазірнуць хоць бы да тых жа эстонцаў.

Дарэчы, я вітаю вяртанне профільнай адукацыі ў сярэднюю школу. Яна дасць магчымасць вызначыць здольнасці кожнага вучня і дапаможа зрабіць яго прафесійны выбар больш раннім і больш дакладным. Але пры гэтым не трэба забываць, што ў кожнага вучня павінна быць базавая адукацыя, неабходныя веды па матэматыцы, гісторыі – па ўсіх тых прадметах, якія варта ведаць кожнаму адукаванаму чалавеку.

**– Ці ўсё Вас задавальняе ў развіцці вышэйшай школы ў краіне?**

– Я чалавек кансерватыўных поглядаў і лічу: трэба вельмі добра падумаць, перш чым нешта змяняць. Мы можам згадаць шмат адмоўных прыкладаў у любой сферы ад паспешліва прынятых рашэнняў, ад непралічаных, няякасна праведзеных рэформ. Важна адно: тое, што якасна працуе, нельга знішчаць – трэба дакладна вызначыць, што нам патрэбна. Калі мы гаворым пра сусветныя тэндэнцыі ў адукацыі і тое, як згодна з імі павінна выглядаць наша сярэдняя і вышэйшая школа, трэба развіваць сваю айчынную адукацыю з улікам нацыянальных традыцый, не адмяжоўваючыся ад сусветнай адукацыйнай прасторы.

Нават у межах Балонскага працэсу сістэму вышэйшай школы можна выбудоўваць па-свойму, як гэта робяць іншыя краіны. Самае галоўнае, на маю думку, тое, што любая рэформа павінна адказваць на фундаментальнае пытанне: якім будзе эканамічны эфект ад функцыянавання адукацыйнай галіны, непасрэдна ад працы тых спецыялістаў, якіх яна рыхтуе, наколькі іх дзейнасць накіравана на карысць дзяржавы.

Усе нашы навучальныя ўстановы, незалежна ад іх узроўню, акрамя сваёй

асноўнай функцыі вучыць і выхоўваць, павінны стаць школай патрыятызму і грамадзянскасці. І ўся сістэма адукацыі павінна працаваць на нацыянальныя інтарэсы Беларусі. Заўсёды з сумам назіраў дынаміку таго, колькі беларускіх студэнтаў вучыцца ў еўрапейскіх універсітэтах. Хацелася б бачыць іншую статыстыку: колькі іх вяртаецца на Радзіму. Безумоўна, я падтрымліваю супрацоўніцтва з іншымі краінамі і непасрэдна з іх навучальнымі ўстановамі, абмен студэнтамі, стажыроўкі выкладчыкаў, імкненне распрацоўваць сумесныя праекты… Але пры гэтым важна не дапусціць, як кажуць, уцечкі мазгоў, выхоўваць у моладзі трывалы, надзейны стрыжань жадання служыць сваёй Айчыне.

Мне вельмі не падабаюцца спробы зрабіць з аспірантуры трэцюю ступень адукацыі. У такім выпадку вучоба ў аспірантуры не будзе залічвацца ў навуковы і працоўны стаж гэтак жа, як і вучоба ва ўніверсітэце. Ёсць прапановы, каб увогуле адмяніць доктарскую ступень, а пакінуць толькі кандыдацкую і выдаваць яе за доктарскую, быццам, пад уплывам норм Балонскага працэсу. Яшчэ раз нагадаю: не трэба бяздумна ламаць тое, што ў нас створана і эфектыўна працуе. Напрыклад, у Германіі, Польшчы, якія таксама з'яўляюцца ўдзельніцамі Балонскага працэсу, захавалі дзве навуковыя ступені: кандыдацкую і доктарскую. Мяркую па сваім вопыце: доктарская дысертацыя – магутны навуковы стымул для далейшага росту навукоўца. Калі ж даследаванне абмежавана адной кандыдацкай дысертацыяй, то, паверце, каэфіцыент карыснага дзеяння рэзка падае, прападае матывацыя працягваць навуковую працу. Усё гэта адбіваецца на якасці выкладання ва ўніверсітэце. Таму кожны калектыў ВНУ павінен быць умацаваны навукоўцамі, кандыдатамі і дактарамі навук, якіх можна лічыць штучным таварам, без якога вышэйшая школа не можа існаваць.

Мяне турбуе і завышаная колькасць набору ў ВНУ – нам столькі студэнтаў і адпаведна спецыялістаў-выпускнікоў не патрэбна. Яшчэ раз паўтару: уся сістэма адукацыі павінна быць прафесійна арыентаванай. У нас жа такога не назіраецца. У 1950–1960-я гады навучальны цыкл ВНУ быў прывязаны да таго ці іншага прадпрыемства, і, як вынік, скажам, выпускнік-інжынер з першага свайго працоўнага дня мог вырашаць складаныя вытворчыя задачы. Ці можа сёння гэтым пахваліцца сярэднестатыстычны выпускнік з вышэйшай адукацыяй? Яму патрэбны час, каб уліцца ў калектыў, унікнуць у сутнасць сваёй працоўнай дзейнасці.

**– Ігар Аляксандравіч, маё апошняе да Вас пытанне – яго я проста не магу не задаць: у час нядаўняй «Вялікай размовы» Прэзідэнта з прадстаўнікамі грамадскасці і СМІ, адказваючы на пытанне наконт мэтазгоднасці стварэння ў Беларусі нацыянальнага ўніверсітэта, дзе б навучанне вялося па-беларуску, кіраўнік дзяржавы назваў Вас у якасці патэнцыяльнага кіраўніка такой ВНУ. Што Вы самі думаеце аб гэтым?**

– Мне ўжо даводзілася агучваць сваю пазіцыю на гэты конт. Паўтару яе яшчэ раз. Я за тое, каб колькасць школ з беларускамоўным навучаннем аб'ектыўна павялічвалася. Я за тое, каб па-беларуску выкладаўся ў школах і ў ВНУ ўвесь гуманітарны блок дысцыплін. Трэба, каб ва ўсіх універсітэтах выкладчыкаў вучылі выкладаць і па-беларуску, тады ў нас не будзе існаваць праблемы з моўнай кампетэнцыяй кадраў. І, натуральна, трэба больш уводзіць у вучэбны працэс беларускай мовы і больш яе вывучаць.

Што датычыцца стварэння нацыянальнага ўніверсітэта, то я не прыхільнік навучальнай рэзервацыі для беларускамоўных. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – сапраўдны нацыянальны ўніверсітэт. Ужо сёння там некаторыя плыні працуюць па-беларуску. Нам спачатку трэба зрабіць рэальнасцю двухмоўе, а пасля ўжо засноўваць беларускамоўны ўніверсітэт. У адваротным выпадку, я тут згодны з некаторымі экспертамі, гэта дарэмная справа і ўпустую патрачаныя грошы.

**– Дзякуй за змястоўную і цікавую размову.**

**Гутарыў Сяргей ГАЛОЎКА**